# Станаўленне прафесійнай музычнай адукацыі ў Беларусі (1917–1941 гг.)

*Працяг. Пачатак у № 4 за 2004 год.*

Няпросты шлях да стварэння стройнай сістэмы падрыхтоўкі прафесійных музыкантаў у Беларусі ў перыяд 1917—1941 гадоў прайшлі не толькі музычныя навучальныя ўстановы Мінска, але і іншых гарадоў Беларусі.

Кастрычніцкая рэвалюцыя, жахі грамадзянскай і першай сусветнай войн абмінулі губернскі Віцебск. Ва ўмовах усеагульнай разрухі ў горадзе тым не менш былі і хлеб, і паліва, і дровы. Гэта прыцягвала сюды творчую інтэлігенцыю з Петраграда і Масквы. Праходзілі канцэрты Дзяржаўнага хору, аматарскага гарадскога сімфанічнага аркестра. Менавіта ў асяроддзі музыкантаў аркестра саспела ідэя адкрыцця вышэйшай музычнай школы (кансерваторыі). Па ініцыятыве Віцебскага аддзялення Усерасійскага саюза аркестрантаў была створана калегія па арганізацыі гэтай навучальнай установы, і летам 1918 года быў атрыманы дазвол аб адкрыцці народнай кансерваторыі па прыкладу Маскоўскай (1906 г.) і Пецярбургскай (1908 г.) народных кансерваторый — музычна-асветніцкіх устаноў, якія назапасілі багаты вопыт музычнага выхавання малазабяспечаных слаёў насельніцтва.

Віцебская народная кансерваторыя пачала працаваць у верасні 1918 года. Яе дырэктарам быў прызначаны прафесар Петраградскай кансерваторыі М.Малько, а сярод выкладчыкаў былі такія вядомыя расійскія навукоўцы, як Л.Пумпянскі і М.Бахцін, таленавітыя музыканты М.Дубасаў, Е.Шуман, Э.Бай, М.Анцаў, А.Бяссмертны, Б.Сухадрэў, Л.Лерман і інш. У гэтым асяроддзі падрастаў будучы знакаміты музыказнавец І.Салярцінскі.

У правінцыі ўважліва сачылі за пераўтварэннямі ў галіне музычнай адукацыі, якія адбываліся ў Петраградзе і Маскве. Так, дэкрэтам Савета Народных Камісараў ад 12 ліпеня 1918 года былі нацыяналізаваны Петраградская і Маскоўская кансерваторыі. Пасля Першага Усерасійскага з'езда па пазашкольнай адукацыі (1919 г.) у Петраградзе і Маскве пачалі адкрывацца народныя школы музычнай асветы. З мэтай стварэння цэласнай сістэмы музычнага навучання і выхавання, уніфікацыі шматлікіх форм музычнай адукацыі, функцыянальнага размежавання разнастайных навучальных устаноў у 1919 годзе былі распрацаваны "Асноўныя палажэнні аб Дзяржаўным музычным універсітэце". Імі прадугледжвалася раздзяленне існуючых спецыяльных музычных навучальных устаноў на тры ступені і стварэнне новых з улікам узросту і ўзроўню ведаў навучэнцаў. Дзяржаўныя дзіцячыя музычныя школы дзяліліся на дзве ступені: першая ступень давала пачатковыя веды музычнай адукацыі для ўсіх жадаючых, а ў школе другой ступені працягвалі займацца толькі тыя, хто меў адпаведныя музычныя веды і здольнасці. Побач з музычнымі школамі ствараліся музычныя студыі, якія ў далейшым сталі асновай для развіцця музычнай самадзейнасці.

У кантэксце рэформ, якія праводзіліся ў Маскве і Петраградзе ў канцы 1918—пачатку 1920 года, Віцебская народная кансерваторыя была ператворана ў музычную школу трох ступеняў (гэта адпавядала ідэі стварэння на базе народных кансерваторый вучэбных комплексаў "музычная школа—тэхнікум— кансерваторыя").

Аднак палітыка ваеннага камунізму ў краіне прывяла да таго, што Віцебская музычная школа на працягу 1920—1921 гадоў апынулася ў складаным становішчы: яна адчувала вострыя недахоп фінансавых сродкаў, пазбавілася часовага будынка, не хапала музычных інструментаў, нотных выданняў. Да таго ж дырэктар і значная частка выкладчыкаў пераехалі ў глыб Расіі, далей ад фронту. Зменшылася колькасць навучэнцаў, былі ліквідаваны спецкласы па навучанні ігры на аркестравых інструментах.

З прызначэннем у 1922 годзе ў якасці дырэктара Віцебскай музычнай школы прафесара Петраградскай кансерваторыі В.Праснякова распачалася арганізацыйна-аднаўленчая праца, якая завяршылася ў канцы гэтага года ператварэннем народнай кансерваторыі ў Віцебскі музычны тэхнікум. Асновай арганізацыі навучальнага працэсу ў ім заставалася дзейнасць сімфанічнага аркестра пад кіраўніцтвам Б.Еўзерава, які складаўся з выкладчыкаў і студэнтаў. Аднак у 1924 годзе з-за фінансавых цяжкасцей і адсутнасці памяшкання для рэпетыцый сімфанічны аркестр быў распушчаны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Акрамя Віцебска народныя кансерваторыі былі адкрыты і ў іншых гарадах цэнтральнай і ўсходняй Беларусі. У Гомелі, які ўваходзіў на той час у склад РСФСР, яна адкрылася 3 ліпеня 1919 г. пасля вызвалення горада ад акупацыі кайзераўскай Германіяй. Для яе адкрыцця шмат зрабіў будучы прафесар Маскоўскай кансерваторыі М.Назараў, запрошаны з Масквы ў пачатку 1918 года на пасаду загадчыка музычнай секцыі губернскага аддзела народнай адукацыі. Ён стварыў у горадзе рабочую музычна-харавую студыю, кіраваў сімфанічным аркестрам, а з 1 студзеня 1920 года быў прызначаны дырэктарам народнай кансерваторыі. Побач з ім працавалі А.Ягораў (будучы прафесар Ленінградскай кансерваторыі), кампазітар А.Туранкоў, скрыпач і дырыжор С.Захарын і інш. Гомельская народная кансерваторыя мела студыі ў рабочых раёнах горада і рэалізоўвала дзве праграмы навучання: музычна-прафесійную і музычна-асветніцкую. На музычна-асветніцкім аддзяленні акцэнт рабіўся на вывучэнне народнай музыкі і песні, методыкі харавых спеваў.

У 1920 годзе народная кансерваторыя была рэарганізавана ў Гомельскую дзяржаўную музычную школу ("музычны універсітэт") з трыма курсамі (ніжэйшым, сярэднім, вышэйшым) у адпаведнасці з узроставай дыферэнцыяцыяй навучэнцаў і зместам музычнай адукацыі, якая ўключала ў сябе ўсе галіны музычнага мастацтва і творчасці. У жніўні 1921 года школа была ператворана ў Гомельскі дзяржаўны музычны тэхнікум (з 1956 г. носіць імя Н.Ф.Сакалоўскага, з 1994 г. — Гомельскі каледж мастацтваў імя Н.Ф.Сакалоўскага). З 1932 года тэхнікум узначаліў выпускнік Мінскага музычнага тэхнікума Б.Фрыдман.

У канцы 1921 года пачалася работа па арганізацыі ў Гомелі яшчэ адной дзяржаўнай музычнай школы І і ІІ ступеняў. Яна адкрылася 2 студзеня 1922 года, а праз год стала Дзяржаўнай прафтэхнічнай музычнай школай І і ІІ ступеняў[2].

Народная кансерваторыя ў Бабруйску адкрылася ў ліпені 1921 года пасля поўнага вызвалення Беларусі Чырвонай Арміяй ад белапалякаў і пасля заключэння Рыжскага мірнага дагавора 1921 года. Паводле умоў дагавора, за БССР захаваліся толькі 6 паветаў Мінскай губерні, у тым ліку і Бабруйскі. Ва ўмовах нэпа (1921 — другая палова 1930-х гадоў) Бабруйская народная кансерваторыя сутыкнулася з вялікімі цяжкасцямі. Аднак назапашаны вопыт арганізацыі музычнай адукацыі ў горадзе спатрэбіўся праз некалькі гадоў, калі ў адпаведнасці з пастановай прэзідыума Бабруйскага гарсавета ад 6 мая 1927 года была адкрыта дзіцячая музычная школа № 1. Першым дырэктарам школы стаў кампазітар Я.Цікоцкі. У яго вучыўся будучы рэктар Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі кампазітар У.Алоўнікаў.

У 1930-я гады дзіцячыя музычныя школы таксама адкрыліся ў Оршы, Мазыры, Слуцку, Барысаве[3].

19 лютага 1919 года ў Магілёве на базе рабочай музычнай студыі была адкрыта дзіцячая музычная школа, якой надалі імя М.А.Рымскага-Корсакава. Яе ўзначаліла В.Салітан, а з пачатку 1920 года — Л.Зісман. У школе працавалі былыя выкладчыкі студыі — піяністка Р.Блюман, скрыпач А.Яўстратаў, віяланчэліст Л.Юшкевіч, а таксама духавік Б.Браудэ, спявак Б.Анчараў, выкладчык гісторыі музыкі Ю.Дрэйзін і інш. На базе школы ў 1919 годзе быў арганізаваны сімфанічны аркестр пад кіраўніцтвам Я.Пеўзнера, а ў 1921-м — хор пад кіраўніцтвам А.Гарадзінскага. У цяжкія гады нэпа школа працавала на дзяржразліку, выкладчыкі атрымлівалі мізэрную зарплату. Але ўстанова не закрылася, засталася адзіным галоўным музычна-адукацыйным цэнтрам горада. У 1937 годзе на яе базе пачало працаваць Магілёўскае музычнае вучылішча імя М.А.Рымскага-Корсакава (цяпер — Магілёўскі вучэбны комплекс "Гімназія-каледж музыкі і харэаграфіі" імя М.А.Рымскага-Корсакава), якое да 1956 года ўзначальваў Л.Зісман[4].

15 сакавіка 1928 года ў Магілёве адкрыўся палітыка-асветніцкі тэхнікум, які паклаў пачатак стварэнню ў краіне культасветвучылішчаў для падрыхтоўкі кадраў работнікаў культуры, кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці, у тым ліку харавой і аркестравай. З 1939 года тэхнікум стаў палітыка-асветніцкай школай, з 1944-га — культурна-асветніцкім вучылішчам, з 1990-га — вучылішчам культуры імя Н.К.Крупскай.

З адкрыццём музычных тэхнікумаў у Віцебску, Гомелі і Мінску сістэма прафесійнай музычнай адукацыі ў краіне да пачатку 1930-х гадоў стабілізавалася. Музычныя школы Віцебска, Магілёва, Гомеля, Бабруйска, Мінска давалі дзецям пачатковую музычную адукацыю. Музычныя тэхнікумы мелі на мэце прафесіяналізацыю музычнай адукацыі. Яны сталі не толькі музычна-адукацыйнымі, але і даследчымі, музычна-асветніцкімі і мастацка-прапагандысцкімі цэнтрамі розных рэгіёнаў Беларусі. Іх дзейнасць падрыхтавала глебу для стварэння нацыянальных прафесійных музычных калектываў і канцэртных арганізацый, для адкрыцця вышэйшай музычнай навучальнай установы.

Варта ўвагі і станаўленне сістэмы прафесійнай музычнай адукацыі ў Заходняй Беларусі. Паводле ўмоў Рыжскага мірнага дагавора, заходняя частка Беларусі адышла да Польшчы. Да яе аб'яднання з БССР у верасні 1939 г. у Брэсце, Гродна, Беластоку і іншых гарадах дзейнічалі прыватныя музычныя навучальныя ўстановы, выпускнікі якіх працягвалі сваю музычную адукацыю ў Варшаўскай кансерваторыі. У Навагрудку працаваў музычны інстытут імя С.Манюшкі, у Брэсце — прыватная музычная школа Малечака і Дзяржаўная музычная школа імя К.Шыманоўскага. У многіх гарадах дзейнічалі музычныя таварыствы, гурткі, харавыя і аркестравыя калектывы.

Пасля 1939 года прыватныя музычныя навучальныя ўстановы былі ператвораны ў дзяржаўныя. Так, у Брэсце на базе школы Малечака адкрылася музычная школа і вучылішча (з 1993 г. Брэсцкі дзяржаўны музычны каледж імя Р.Шырмы). У вучылішчы былі створаны духавы, народны і сімфанічны аркестры, харавы калектыў. Дзяржаўныя музычныя школы пачалі працаваць у Вілейцы, Навагрудку, Пінску, Ваўкавыску, Лідзе, Маладзечне, Слоніме і іншых гарадах[5].

Такім чынам, у 1937 годзе ў сістэму прафесійнай музычнай аду-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кацыі Беларусі ўваходзілі кансерваторыя (вышэйшая ступень), Мінскі, Гомельскі, Віцебскі музычныя тэхнікумы (сярэдняя ступень), дзяржаўныя музычныя школы ў Магілёве, Віцебску, Гомелі, Бабруйску, Мінску, Оршы, Барысаве, Мазыры, Слуцку (ніжэйшая ступень). На пачатак 1941 года ў Беларусі дзейнічалі кансерваторыя, 6 музычных вучылішчаў і 19 дзяржаўных дзіцячых музычных школ[6].

Перыяд 1917—1941 гадоў у гісторыі беларускай музычнай адукацыі быў складаны і супярэчлівы, насычаны разнастайнымі падзеямі. Ён шмат у чым вызначыў поспехі ў станаўленні нацыянальнага музычнага мастацтва савецкага перыяду і заклаў падмурак развіцця сістэмы прафесійнай музычнай адукацыі ў пасляваенны час.

[1] Гапеева Н. Пра росквіт, заняпад і надзею на адраджэнне // Літаратура і мастацтва. 1991, 13 снежня; Масленікава В.П. Музычная адукацыя ў Беларусі. Мн., 1980. С. 75.
[2] Кірыленка Э. Ад першых выпускаў... // Літаратура і мастацтва. 1994, 14 кастрычніка; Шныпаркоў А. Свята заўсёды з намі... // Гомельскія ведамасці. 1999, 2 снежня; Масленікава В.П. Музычная адукацыя ў Беларусі. С. 61—62.
[3] Масленікава В.П. Музычная адукацыя ў Беларусі. С. 51, 63.
[4] Марозава В. Музычная калыска Магілёўшчыны // Мастацтва. 1999, № 12. С. 46—48; Масленікава В.П. Музычная адукацыя ў Беларусі. С. 60—61.
[5] Пракапцова В.П. Мастацкая адукацыя ў Беларусі. Мн., 1999; Масленікава В.П. Музычная адукацыя ў Беларусі. С. 104.
[6] Літаратура і мастацтва. 1941, 19 красавіка.

# Идея вечного возвращения в музыке





**МАРТЫСЮК Павел Григорьевич** – профессор кафедры философии Академии МВД Республики Беларусь, кандидат философских наук

В мифе реализуется потребность человека в построении картины упорядоченного и единого мира. Это становится возможным благодаря идее вечного возвращения, которая является важнейшим элементом содержания мифа и благодаря своей трансцендентной природе формирует как устойчивые основания самого мифа, так и статус его неизменного присутствия в культуре. Идея вечного возвращения была обусловлена тягой человека к обретению полноты бытия и раскрывается через систему неизменных экзистенциальных ориентаций мифа и мифосодержащих эмоционально-художественных форм культуры.

Истоки музыки – в мифе, поэтому она изначально обладает мифическими характеристиками. Исследовав природу мифического сознания, С.Лангер указал на то, что «его содержание не разделяется четко на символ и объект, но оба они, как правило, сливаются в одно совершенно неразличимое целое»[1]. Мифическая направленность архаической культуры определяет специфику музыки того времени. При этом необходимо обратить внимание на то, что в ранний культурно-исторический период музыка отличается несамостоятельностью, несмотря на то, что является важнейшей составляющей мифологической картины мира. Самостоятельность как проявление самодостаточности музыка обретает позднее, уже в рамках новоевропейской культуры. На ранних этапах становления культуры несамостоятельность музыки проявлялась в присущих ей магических свойствах, благодаря которым она наделялась способностью управлять природными объектами, излечивать больных и т. д. Музыка обладала пассивностью, так как, по мнению древних греков, даровалась богами музыкантам и певцам. К тому же она характеризовалась подчеркнуто выраженными антропоморфными чертами, так как непосредственно соотносилась с различными божествами и героями. Например, в древнегреческой мифологии музыка воплощалась в божественном начале: музах, богах, а также в герое Орфее и других мифологических персонажах. Боги Пан и Марс играли на свирели, Аполлон на арфе, Орфей на форминге. Однако, совпадая с тем или иным мифическим персонажем, музыка оказывается столь значительной, что способна сохранять свои возможности и в случае разрушения жизненной субстанции ее носителя. Неслучайно, ког-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ